УДК 796.032:316.7«20»

***Уладзімір Паўлавіч Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Uladzimir Lukievich***
*PhD in Philosophy, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Sports Disciplines and Methods of Teaching Them*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: lucul@brsu.brest.by

# ТОМАС БАХ: ФІЛАСОФІЯ АЛІМПІЗМУ Ў САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ РЭАЛІЯХ СУЧАСНАГА ГРАМАДСТВА

*Прэзідэнтура Томаса Баха ў Міжнародным алімпійскім камітэце прыйшлася на вельмі складаны ў шмат якіх аспектах перыяд. Дастаткова толькі пералічыць праблемы, звязаныя з допінгавым злоўжываннем на дзяржаўным узроўні, карупцыйнымі скандаламі ў алімпійскім атачэнні і распаўсюджваннем пандэміі COVID-19. Тым не менш Томас Бах здолеў захаваць і забяспечыць фінансавую стабільнасць МАК, больш за тое, як кіраўнік новай фармацыі, прапанаваў у духу постструктуралізму змяніць падыходы да вызначэння месца і ролі спорту ў сучасным грамадстве. У прыватнасці, ён акцэнтаваў увагу на фундаментальных каштоўнасцях філасофіі алімпізму, што ўвасобілася ў новых рэдакцыях Алімпійскай хартыі і Этычнага кодэкса. Спорт у інтэрпрэтацыі Томаса Баха паўстае ў якасці ўніверсальнага сродку кансалідацыі людзей у варунках эпідэміялагічнай небяспекі і стварае перспектывы наступнай інтэграцыі грамадства. Маральны складнік спартыўнай дзейнасці, на яго думку, павінен спрыяць замацаванню прынцыпаў Fair play у сістэме алімпійскага руху.*

***Ключавыя словы:*** *Томас Бах, філасофія, этыка, спорт, алімпізм, каштоўнасці, глабалізацыя, допінг, пандэмія.*

## Thomas Bach: The Philosophy of Olympism in the Socio-Cultural Realities of Modern Society

*Thomas Bach's presidential term in the International Olympic Committee coincided with a very difficult period in many aspects. It is enough just to list the problems that were associated with the system of doping abuse at the state level, corruption scandals in the Olympic environment and the spread of the COVID-19 pandemic. Nevertheless, Thomas Bach managed to preserve and ensure the financial stability of the IOC, and moreover, as the head of the new formation he proposed, in the spirit of post-structuralism, to change approaches to determining the place and role of sports in modern society. In particular, he focused on the fundamental values of the philosophy of Olympism, which was embodied in the new editions of the Olympic Charter and the Code of Ethics. Sport in the interpretation of Thomas Bach manifests itself as a universal means of consolidating people in conditions of epidemiological danger and creates prospects for the subsequent integration of society. The moral component of sports activity, in his opinion, should help contribute to the priority consolidation of the Fair play principles in the system of the Olympic movement.*

***Key words:*** *Thomas Bach, philosophy, ethics, sport, Olympism, values, globalization, doping, pandemic.*

**Уводзіны**

Нямецкі спартыўны функцыянер Томас Бах (Thomas Bach) быў абраны прэзідэнтам Міжнароднага алімпійскага камітэта 10 верасня 2013 г. на 125-й сесіі МАК у Буэнас-Айрэсе і стаў дзявятым кіраўніком гэтай самай уплывовай спартыўнай няўрадавай арганізацыі на свеце. У заключным туры галасавання ён набраў 49 галасоў, што дало яму неабходную колькасць для перамогі. У выніку ён апярэдзіў іншых прэтэндэнтаў, сярод якіх былі Сяргей Бубка (Украіна), Рычард Кэрыён (Пуэрта-Рыка), Нг Сэр Міянг (Сінгапур), Дэніс Освальд (Швейцарыя) і Ву Чынг-куа (Кітайскі Тайбэй).

Томас Бах нарадзіўся 29 снежня 1953 г. у Вюрцбургу, што знаходзіцца на паўночным захадзе федэральнай зямлі Баварыя. Яго бацькі, Марыя і Андрэас, былі прыхільнікамі спорту, і гэта вызначыла лёс сына, які, нягледзячы на захапленне футболам, прыняў пад увагу парады бацькоў заняцца фехтаваннем. Поспехі не прымусілі сябе чакаць. Пасля заваявання медалёў на юніёрскіх першынствах свету 1971 і 1973 гг. Бах перамагаў на чэмпіянаце свету па фехтаванні на рапірах 1977 г. у складзе зборнай

каманды Федэратыўнай Рэспублікі Германіі. Але найвышэйшым яго дасягненнем трэба лічыць тытул алімпійскага чэмпіёна ў камандных спаборніцтвах у гэтым відзе спорту на XXI летніх гульнях 1976 г. у Манрэалі.

Падчас вучобы ва ўніверсітэце Вюрцбурга (права і палітычныя навукі), які ён паспяхова скончыў у 1979 г., Бах спецыялізаваўся ў галіне юрыспрудэнцыі. Пазней, у 1983 г. была напісана і абаронена навуковая праца «The influence of predictions on the jurisprudence of the Federal Constitutional Court» (Уплыў прагнозаў на юрыспрудэнцыю Федэральнага суда), за што ён атрымаў ступень доктара ў галіне юрыдычных навук. У тым жа 1983 г. ён заснаваў сваю юрыдычную фірму і шмат працаваў у якасці дарадцы ў назіральных складах разнастайных арганізацый і міжнародных кампаній. Так, напрыклад, пэўны час ён выконваў абавязкі дырэктара па пытаннях прамоцыі ў фірме Adidas, узначальваў Кансультатыўную раду Федэральнага міністэрства эканомікі Германіі, а таксама на працягу шэрага гадоў супрацоўнічаў з такімі вядомымі кампаніямі, як Michael Weinig AG, Weinig International AG, Melius GmbH, Nürnberger Versicherung AG Austria, Bartec GmbH і інш. У якасці дадатковай асабістай характарыстыкі неабходна адзначыць, што Томас Бах знешне выглядае як ветлівая і кантактная асоба, акрамя таго свабодна валодае нямецкай, англійскай, іспанскай і французскай мовамі.

Актыўная дзейнасць Томаса Баха праявілася таксама і ў тым, што ён не толькі не пакідаў сваёй працы ў галіне права, але з няменшым імпэтам уключыўся ў спартыўнае адміністраванне. Кароткі пералік удзелу у гэтай сістэме дае дастаткова ўяўнае ўражанне пра яго працу ў дадзенай сферы. У першую чаргу трэба адзначыць кіраўніцтва на пасадзе старшыні Камісіі спартоўцаў Нямецкага камітэта па спаборніцтвах Германскай канфедэрацыі спорту (1979–1981), выкананне абавязкаў індывідуальнага члена Нацыянальнага алімпійскага камітэта Германіі (1982–1991), старшыні Апеляцыйнага аддзела Спартыўнага арбітражнага суда (міжнароднага судовага органа, які выносіць прававыя рашэнні, што маюць дачыненне да спорту), члена Назіральнай рады Арганізацыйнага камітэта Чэмпіяната свету па футболе 2006 г., прэзідэнта-заснавальніка (2006), а затым ганаровага прэзідэнта Нямецкай алімпійскай спартыўнай канфедэрацыі, старшыні Апякунскай рады Арганізацыйнага камітэта Чэмпіяната свету па футболе сярод жанчын 2011 г., старшыні (2013) Міжнароднага фонду алімпійскага перамір'я (заснаваны ў 2000 г. урадам Грэцыі з удзелам МАК дзеля садзейнічання ў распаўсюджванні алімпійскіх ідэалаў праз спорт). Акрамя таго, ён аўтар шэрагу публікацый па пытаннях права, эканомікі і спорту, а таксама ў розных краінах вызначаны як ганаровы прафесар і доктар Honoris Causa.

Не менш імклівa развівалася кар'ера Томаса Баха ў структуры Міжнароднага алімпійскага камітэта. Так, ён прадстаўляў спартсменаў на XI Алімпійскім кангрэсе ў Бадэн-Бадэне яшчэ ў 1981 г. і быў адным з заснавальнікаў Камісіі спартсменаў МАК. У 1991 г. ён становіцца членам Міжнароднага алімпійскага камітэта, затым у 1996 г. выбіраецца членам Выканаўчай рады МАК, а потым у 2000–2013 гг. займае пост віцэ-прэзідэнта МАК і, нарэшце, з 2013 г. узначальвае Міжнародны алімпійскі камітэт у якасці прэзідэнта [16]. З 1977 г. знаходзіцца ў шлюбе з Клаўдзіяй Бах.

Паданая вышэй разгорнутая характарыстыка акрэслівае Томаса Баха як неардынарнага чалавека, які гарманічна спалучае ў сабе дасведчанасць алімпійскага чэмпіёна і спартыўнага адміністратара з практычнай дзейнасцю топ-менеджара ў галіне эканомікі, юрыспрудэнцыі і public relations, а таксама мае навуковую ступень.

***Мэта працы.*** Закцэнтавана ўвага на вызначальнай ролі прэзідэнта МАК як асобы новай фармацыі ў справе актуалізацыі і замацавання фундаментальных філасофскіх прынцыпаў Алімпійскай хартыі ва ўмовах барацьбы з допінгам і пандэміяй COVID-19 у святле сацыяльна-эканамічных і палітычных змяненняў функцыянавання сучаснага грамадства.

***Метады даследавання.*** Падчас напісання артыкула выкарыстоўваліся такія метады даследавання, як назіранне, апісанне, параўнанне, аналіз навуковых і дакументальных друкаваных крыніц, а таксама вывучэнне адкрытай у доступе інтэрнэт-інфармацыі.

**Вынікі і абмеркаванне**

Падчас сваёй прэзідэнтуры Томас Бах быў вымушаны прымаць лёсавызначальныя рашэнні, якія былі звязаныя пераважна з допінгавым скандалам у расійскім спорце, распаўсюджваннем пандэміі COVID-19, карупцыяй і ігнараваннем правоў чалавека.

Калі Томас Бах у 38-гадовым узросце быў выбраны членам МАК, то ўжо тады ён карыстаўся рэпутацыяй кампетэнтнага юрыста, добрага адміністратара, меў навуковую ступень, вызначаўся высокім узроўнем эрудыцыі, свабодна валодаў некалькімі замежнымі мовамі. Па вялікім рахунку, меліся ўсе падставы, каб стаць лідарам сусветнага спорту. Ён падтрымліваў стратэгію кіравання, якая была распрацаваная яго папярэднікам Жакам Рагэ, і акцэнтаваў увагу на непрымірымай барацьбе з допінгам як найбольшай небяспекай сучаснага спорту [13, с. 70].

Адным з галоўных пастулатаў яго перадвыбарчай кампаніі, якім ён скарыў сэрцы сваіх прыхільнікаў, стаў выраз «Адзінства ў разнастайнасці». Змест гэтага дэвізу змяшчаў такія галоўныя складнікі, як аўтарытэт, устойлівасць і супрацоўніцтва, а таксама адэкватнае разуменне стану эканамічнага, экалагічнага і сацыяльнага аспектаў навакольнага асяроддзя. Постаць Томаса Баха, як адзначае доктар Антоніа Санчас Пата з Каталіцкага ўніверсітэта ў Мурсіі (Іспанія), можна разглядаць у якасці парадыгматычнага прыкладу «падвойнага ўвасаблення» – транскрыпцыю грэчаскага ідэалу інтэгральнай адукацыі, што акрэсліваецца паняццем «паідэя». Томас Бах здолеў сумясціць грунтоўную акадэмічную падрыхтоўку з бліскучай спартыўнай кар'ерай, што прывяло да паспяховага прафесійнага жыцця. У практыцы сваёй дзейнасці Бах заўсёды надаваў вялікае значэнне сістэме каштоўнасцяў. Ён пастаянна звяртае на гэта ўвагу ў сваіх шматлікіх выступленнях. На яго думку, яны з'яўляюцца менавіта тым, што адрознівае алімпізм ад уласна спорту: гэта філасофія жыцця, якая заахвочвае павагу, сумленную гульню, адданасць справе, самакантроль, дысцыпліну і радасць ад намаганняў уключна з сапраўднай універсальнасцю, адзінствам, інтэграцыяй і міжнародным паразуменнем, што не можа не выклікаць пэўныя асацыяцыі з ідэямі знакамітага французскага грамадскага дзеяча і педагога барона П'ера дэ Кубертэна, намаганнямі якога былі адроджаныя традыцыі старажытнагрэчаскіх Алімпійскіх гульняў у сучасным іх варыянце [12, с. 156–158]. Таму ён прапаноўвае павялічыць значэнне каштоўнасцяў спорту. Яго грунтоўнае дасведчанне не падвяргаецца сумненню, калі ўзяць пад увагу ранейшую працу ў разнастайных камісіях МАК, напрыклад па спорце і праву, барацьбе з допінгам, тэлевізійных правах і новых сродках масавай інфармацыі, прэсе, маркетынгу, алімпійскім руху і г. д.

Не лішне заўважыць, што хоць Бах нарадзіўся і вырас у Заходняй Германіі, ён у свой час выказаўся супраць палітычнага байкоту XXII летніх Алімпійскіх гульняў 1980 г. у Маскве. Упэўненасць у тым, што праз спорт можна вырашаць шэраг глабальных праблем, прывяла да звароту да Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, каб прыняць рэзалюцыю аб неабходнасці захавання «алімпійскага перамір'я» на час правядзення XXXII Гульняў у Токіа. Прыняцце рэзалюцыі аб алімпійскім перамір'і стала сведчаннем падтрымкі Алімпіяды і трактавалася як сапраўдны сімвал міру. Гэтым самым ён яшчэ раз прадэманстраваў сваю адданасць філасофскім прынцыпам алімпізму: «Мэта алімпізму заключаецца ў тым, каб спорт спрыяў гарманічнаму развіццю чалавецтва, садзейнічаў стварэнню мірнага грамадства, якое клапоціцца аб захаванні людской годнасці» [10, с. 11]. Зразумела, што рэзалюцыя была прынятая адзінагалосна. Праўда, трэба заўсёды прымаць пад увагу сучасныя рэаліі, бо мноства гуманных памкненняў засталіся толькі ў якасці добрых намераў.

Спорт на сучасным этапе свайго развіцця, як, дарэчы, і ўсё сусветнае грамадства, перажывае крызіс. Адной з яго праяў з'яўляецца допінгавае злоўжыванне. У дадзеным выпадку адбываецца не толькі ўсвядомленае парушэнне маральных нормаў, назіраецца ўяўная тэндэнцыя ў накірунку да Foul play (несумленная гульня, махлярства), хоць Этычны кодэкс МАК падкрэслівае, што ўніверсальныя маральныя прынцыпы з'яўляюцца падставай алімпізму, і гэта выяўляецца ў захаванні павагі да алімпійскага духу, які патрабуе ўзаемапаразумення з духам дружбы, салідарнасці і Fair play [3, с. 14].

У перыяд кіравання Томаса Баха адбыўся грандыёзны скандал, звязаны з масавым прымяненнм допінгу спартсменамі Расійскай Федэрацыі. Падставовыя высновы

былі зробленыя канадскім прафесарам Рычардам МакЛаранам з Універсітэта Заходняга Антарыа, старшынёй камісіі Сусветнага антыдопінгавага агенцтва (САДА) па расследаванні абвінавачванняў у допінгмахлярстве на XXII зімовай Алімпіядзе 2014 г. у Сочы, які стаў сусветна вядомым як аўтар знакамітага «даклада МакЛарана», што складаецца з дзвюх частак [14; 15].

Допінгавая праблема ўскладнялася тым, што гэта былі не адзінкавыя выпадкі ўжывання забароненых сродкаў асобнымі спартсменамі. У працэсе расследавання МАК і САДА выявіліся факты, якія немагчыма было абвергнуць, – спонсарства допінгу з боку дзяржавы. Напрыклад, на XXII зімовых Алімпійскіх гульнях 2014 г. у Сочы расійскія атлеты выкарыстоўвалі забароненыя прэпараты, затым іх допінг-пробы падмяняліся ў лабараторыі, дзе павінен быў ажыццяўляцца кантроль. Сведчанні былога кіраўніка Маскоўскай антыдопінгавай лабараторыі доктара Рыгора Родчанкава (пазней атрымаў прытулак у ЗША; з'яўляецца галоўным інфарматарам САДА ў справе допінгу ў расійскім спорце) аб масавым ужыванні расійскімі спартсменамі допінгу на Гульнях у Сочы ўдакладняліся спасылкамі на тое, што асабіста ім быў распрацаваны «адмысловы кактэйль» з трох забароненых стымулятараў, што далей змешваўся з алкаголем. Праз чатыры гады Томас Бах выступіў з прамовай на цырымоніі адкрыцця XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 г. у паўднёвакарэйскім горадзе Пхёнчхан, дзе заклікаў спартсменаў паважаць правілы і заставацца «чыстымі», што шырока інтэрпрэтавалася як спасылка на расійскі скандал. Ён вымушаны быў зрабіць такую заяву, таму што трапіў пад жорсткую крытыку міжнароднай спартыўнай грамадскасці ў справе дзяржаўнага спонсарства допінгу ў спорце, што перад усім датычылася махлярства ў гэтай галіне з боку Расіі [1].

Сусветнае антыдопінгавае агенцтва адзінагалосна забараніла ўдзел Расіі ў Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах свету і іншых міжнародных спаборніцтвах на чатыры гады. Гэта была рэакцыя спартыўнай супольнасці на допінгавыя маніпуляцыі, якія цягнуцца з 2014 г. Расіянам было прапанавана прывесці ў адпаведны парадак сваю сістэму антыдопінгавага кантролю, але гэта зроблена не было. Тым не менш, згодна з пастановай САДА, «чыстыя» спартсмены Расійскай Федэрацыі, якія пройдуць папярэдні адбор, будуць мець права выступаць у якасці «нейтральных спартоўцаў»: без выкарыстання дзяржаўнага сцяга і гімна [11].

Падчас V Сусветнай канферэнцыі па допінгу ў спорце, якая адбылася 7 лістапада 2019 г. у Катавіцэ (Польшча), было анансавана, што неўзабаве можа з'явіцца новы эфектыўны сродак тэставання генаў, які стане перашкодай для ашуканства. Па словах Баха, гэта метад папярэджання допінгавага злоўжывання, які разлічаны на тое, каб махляры не адчувалі сябе ў бяспецы нідзе і ніколі. Новы генны тэст распрацаваны прафесарам Янісам Піціладзісам з універсітэта ў Брайтане (Англія), які спецыялізуецца ў галіне спартыўнай генэтыкі і з'яўляецца членам медыцынскай і навуковай камісіі МАК [4]. Новая тэхналогія дазваляе выявіць допінг у крыві нават праз некалькі месяцаў пасля таго, як ён быў ужыты. На думку Баха, праграма тэставання напярэдадні наступных Алімпійскіх гульняў будзе самай разгалінаванай у гісторыі і накіравана на максімальнае выяўленне забароненых сродкаў, што павінна стаць фактарам стрымлівання для спартсменаў [5]. Дарэчы, МАК ужо ў кастрычніку 2015 г. патрабаваў зрабіць усю антыдопінгавую сістэму незалежнай ад спартыўных арганізацый, а для Алімпійскіх гульняў 2016 г. дэлегіраваў усю сваю сістэму санкцый Спартыўнаму арбітражнаму суду ў Лазане. Сам Томас Бах падкрэслівае, што філасофія алімпізму грунтуецца на абсалютнай нецярпімасці ў адносінах да допінгу, карупцыі і ўсіх відаў маніпуляцыі. Зыходзячы з асабістай дасведчанасці як былога алімпійца і міжнароднага прадстаўніка спартсменаў, ён падтрымлівае прапанову аб пажыццёвай забароне на ўдзел у спаборніцтвах за кожнае ўжыванне спартсменам допінгу. Спартсмены павінны прытрымлівацца прынцыпаў Fair play, таму неабходна забяспечыць справядлівую працэдуру для ўсіх, каб захаваць алімпійскія каштоўнасці [8]. Для павышэння важнасці барацьбы супраць допінгу Правіла 40 Алімпійскай хартыі адмыслова падкрэслівае, што ўдзельнікі Алімпіяды, а менавіта спартсмены, афіцыйныя асобы і персанал каманды, павінны паважаць і выконваць палажэнні не толькі дадзенага дакумента, але і Сусветнага антыдопінгавага кодэкса [10, с. 76].

Яшчэ адной асаблівай праблемай для МАК стала пандэмія COVID-19, якая прымусіла перанесці XXXII летнія Алімпійскія гульні 2020 г. у Токіа. У выніку было прынята беспрэцэдэнтнае рашэнне правесці Алімпіяду з 23 ліпеня па 8 жніўня 2021 г. У лісце-звароце да Алімпійскага руху «Алімпізм і Карона» ад 29 красавіка 2020 г. Томас Бах падкрэсліў, што ўсе мы знаходзімся ва ўмовах глабальнай пандэміі COVID-19 і жывём у даволі нявызначанай сітуацыі, калі толькі пачынаем асэнсоўваць наступствы крызісу каранавіруса на ўсім свеце. Аднак ужо сёння відавочна, што пандэмія значна паўплывала на ўсе сферы жыцця грамадства, і спорт не з'яўляецца выключэннем. Перанос летніх Алімпійскіх гульняў 2020 г. запатрабаваў усталявання антыкрызіснага кіравання, якое патрабуе салідарнасці, творчага падыходу, рашучасці і гнуткасці. Напрыклад, толькі затраты на перанос тэрмінаў правядзення Алімпіяды-2020 у Токіа складаюць сотні мільёнаў амерыканскіх долараў. Прычым пры правядзенні адкладзеных Гульняў неабходна ўлічваць рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, каб стаць бяспечнымі ў плане здароўя для ўсіх удзельнікаў, а таксама прадэманстраваць адзінства сусветнага грамадства. Алімпійскія гульні ў такой сітуацыі выглядаюць моцным сігналам надзеі ў гэты беспрэцэдэнтны час [7].

У прамове на 136-й сесіі МАК у Лазане 17 ліпеня 2020 г. Т. Бах падкрэсліў, што намаганні МАК у справе супрацьдзеяння пандэміі падтрыманыя не толькі дзяржавамі – членамі ААН, але таксама на ўзроўні лідараў G20 (краіны з найбольш развітой эканомікай, на долю якіх прыходзіцца 85 % сусветнага валавага нацыянальнага прадукта), Рады Еўрапейскага саюзу, СААЗ і інш. Усім прыйдзецца нечым ахвяраваць, і толькі зараз прыходзіць асэнсаванне таго, які сцэнарый развіцця свету будзе дамінаваць пасля пандэміі. На жаль, у некаторых рэгіёнах на розных кантынентах ужо зараз бачныя яўныя прыкметы таго, што грамадства і нацыі больш схіляюцца да эгаізму і карыслівасці. А гэта, у сваю чаргу, павялічвае канфрантацыю і палітызацыю ўсіх бакоў жыцця, у тым ліку культуры, эканомікі, аховы здароўя, навукі, гуманітарнай дапамогі і нават у галіне барацьбы з допінгам [18].

Сёння ніхто не ведае, як будзе выглядаць свет пасля пандэміі. Зразумела, што чакаюцца глыбокія крызісныя тэндэнцыі для грамадства ў цэлым. І гэта таксама датычыцца спорту як сацыяльнага феномена, яго фундаментальных філасофскіх прынцыпаў. Тым не менш ужо цяпер неабходна зрабіць некаторыя прагнозы адносна далейшага развіцця. Томас Бах прэзэнтуе тры шырокія магчымыя сцэнарыі, якія хоць і не з'яўляюцца вычарпальнымі і наўрад ці рэалізуюцца ў чыстым выглядзе (на што мае ўплыў культурны, нацыянальны і рэгіянальны фон), але маюць магчымасці да ажыццяўлення.

Згодна з першым сцэнарыем, грамадства будзе спрабаваць працягваць функцыянаваць, як у дакрызісныя часы. У такім выпадку сітуацыя яшчэ пагоршыцца, сацыяльная і эканамічная няроўнасць павялічыцца. Сусветная супольнасць не зможа выкарыстоўваць ужо выпрацаваныя алгарытмы, напрыклад тыя, што вынайшлі на падставе фінансавага крызісу 2008 г. Зараз жа патрабуецца чалавечае майстэрства, дасведчанасць і творчы падыход іншага кшталту.

Другі сцэнарый выяўляе пагрозу нашмат большага падзелу чалавецтва, узмацнення няроўнасці з усім спектрам сацыяльнай рызыкі, а гэта прывядзе да рэзкага абвастрэння міжнародных адносін, пратэкцыянізму і палітычнага супрацьстаяння ва ўсіх аспектах жыцця людзей. Бах падкрэслівае, што ў гэтым супрацьборстве эканоміка, спорт, культура, гуманітарная дапамога ператворацца ў палітычныя інструменты.

Рысы трэцяга сцэнарыя акцэнтуюць увагу на павелічэнне салідарнасці і міжнароднага супрацоўніцтва. Іншымі словамі, будучыня чалавецтва не можа быць у пэўным сэнсе прадказаная ці сфармаваная, калі абапірацца выключна на тэхналогіі. Ні адзін чалавек, ні адзін урад, ні адна нацыя не ў стане вырашыць глабальныя праблемы свету паасобку. Толькі намаганні па справядлівым падзеле цяжкасцяў крызісу паміж людзьмі і краінамі, замацаванне справядлівага сусветнага парадку, падставай якога з'яўляецца супрацоўніцтва, могуць прывесці да стабілізацыі [7]. Алімпійскі рух прымае пад увагу ўсе вышэйназваныя сцэнарыі, улічвае, што яны маюць самае непасрэднае дачыненне да спорту. Таму на падставе галоўных алімпійскіх каштоўнасцяў,

сярод якіх у першую чаргу называюцца мір, салідарнасць, павага і адзінства ва ўсёй яго разнастайнасці, можна зрабіць важны ўнёсак у посткаранавірусны свет. У посткаранавірусным грамадстве сістэма аховы здароўя будзе мець першараднае значэнне, і тым самым павялічваецца роля спорту і фізічнай актыўнасці ў барацьбе з наступствамі пандэміі. Прычым, важна падкрэсліць, спорт – гэта практычна адзіны від сацыяльнай актыўнасці людзей, які аб’ядноўвае іх незалежна ад нацыянальнай, расавай, культурнай, сацыяльнай, палітычнай, рэлігійнай і іншай прыналежнасці.

Адсутнасць дыскрымінацыі таксама з’яўляецца адным з фундаментальных прынцыпаў алімпізму, пра што гаворыцца ў Алімпійскай хартыі. Ажыццяўленне правоў і свабод прадугледжваецца галоўным канстытуцыйным дакументам МАК і павінна забяспечвацца адсутнасцю ўсялякай яе формы: расавага і гендарнага характару, колеру скуры, сексуальнай арыентацыі, мовы, рэлігіі, выказвання палітычнага альбо якога іншага меркавання, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, наяўнасці маёмасці, нараджэння ці якога іншага статусу [10, с. 12]. Салідарнасць і адсутнасць дыскрымінацыі з’яўляюцца дамінантнымі каштоўнасцямі ў спорце. МАК падтрымлівае тых спартоўцаў, якія іх акцэптуюць, выказваюцца ў іх абарону, дапамагаюць іншым, удзельнічаюць у жыцці сваёй супольнасці.

Разам з тым наспеў час выказацца адносна правіла 50 Алімпійскай хартыі, у якім гаворыцца пра забарону з боку МАК усялякай рэкламы ці публічнага асвятлення мерапрыемстваў (за выключэннем выпадкаў, калі яны афіцыйна дазволены арганізатарамі), што адбываюцца пад эгідай Міжнароднага алімпійскага камітэта ў межах спартыўных аб’ектаў, дзе праводзяцца спаборніцтвы, з мэтай іх камерцыйнага выкарыстання, а таксама не дапускаецца ніякай дэманстрацыі альбо прапаганды палітычнага, рэлігійнага ці расавага характару [10, с. 90]. Важна падкрэсліць, што атлеты ў кожным выпадку маюць мноства магчымасцяў выказаць свае думкі падчас Алімпійскіх гульняў на прэсавых канферэнцыях, у змешаных зонах, сацыяльных сетках, інтэрв’ю, падчас камандных сустрэч і інш. Такім чынам, правіла 50 мае датычыненне толькі да гульнявой пляцоўкі і цырымоній [18].

Ва ўмовах усё большай канфрантацыі і глыбокага крызісу ў свеце на спорт ускладаецца найважнейшая місія па вырашэнні шмат якіх праблем. Людзям неабходная сіла аб’яднання, якую даюць Алімпійскія гульні, што ўвасабляецца ў салідарнасці і чалавечым адзінстве ва ўсёй яго разнастайнасці [18, с. 18 ].

У прамове 17 ліпеня 2020 г. Томас Бах выказаўся наступным чынам: «Байкоты і дыскрымінацыя па палітычных матывах ці нацыянальнасці зноў уяўляюць сабой рэальную небяспеку… Спартыўны байкот толькі карае спартсменаў краіны, якая байкатуе, і пазбаўляе іх людзей магчымасці падзяляць поспех, гонар і радасць сваёй алімпійскай каманды» [6]. Але па вялікім рахунку ён спрабуе прытрымлівацца той самай стратэгіі ў адносінах з патэнцыяльнымі гаспадарамі Гульняў, якую не аднойчы выкарыстоўвалі яго папярэднікі на пасадзе прэзідэнта МАК, як, напрыклад, у 1936 г. Анры дэ Байле-Лятур, па магчымасці пазбягаць адкрытай канфрантацыі.

Маральная праблематыка дзейнасці МАК усё часцей з’яўляецца прадметам разнастайных дыскусій. Абмяркоўваюцца, напрыклад, пытанні, чаму, калі на Гульнях у асноўным бясплатна спаборнічаюць дзесяць з паловай тысяч спартсменаў, МАК падпісвае камерцыйныя кантракты на мільярды долараў. Зразумела, што атлеты атрымліваюць свае ганарары ад Нацыянальных алімпійскіх камітэтаў і спонсараў, але іх нельга параўноўваць па велічыні з аплатамі алімпійскіх функцыянераў. МАК працягвае ігнараваць патрабаванні правіла 40 Алімпійскай хартыі, якое рэгулюе ўзаемаадносіны спартсменаў з тымі спонсарамі, што не з’яўляюцца афіцыйна зарэгістраванымі на Гульнях [10, с. 76]. Такім чынам, Міжнародны алімпійскі камітэт абараняе свае фінансавыя інтарэсы, але ў шэрагу выпадкаў менавіта яны (афіцыйна не зарэгістраваныя спонсары) матэрыяльна падтрымліваюць асобных спартсменаў, і атлеты могуць трапіць пад санкцыі проста з-за таго, што публічна выкажуць ім сваю падзяку, напрыклад, у Instagram. Альбо: МАК ахвяруе САДА 15 млн долараў, а кантракт з тэлекампаніяй NBC на паказ Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра дасягае 1,23 млрд долараў [17].

Адносна палітычнага ўплыву спорту можна сцвярджаць, што ў шэрагу рэгіёнаў свету ён моцна звязаны з нацыяналізмам і пратэкцыянізмам, а гэта, у сваю чаргу, абвастрае палітычную канфрантацыю. Такая пазіцыя ні ў якім разе не садзейнічае захаванню фундаментальных прынцыпаў алімпізму, стварае небяспеку ў адносінах да алімпійскіх каштоўнасцяў. Умацаванне салідарнасці і ўзаемакарыснае міжнароднае супрацоўніцтва дае больш станоўчыя вынікі, чым палітыка ізаляцыянізму. Алімпійскія гульні ўсведамляюцца як унікальная спартыўная, культурная і сацыяльная падзея, і не павінна быць падстаў, заснаваных на палітычных альбо якіх іншых спрэчных пытаннях, для іх анігіляцыі і дыскрымінацыі ў любой форме [7].

**Заключэнне**

Перыяд кіравання Томаса Баха, нягледзячы на шэраг скандальных сітуацый, выглядае як час фінансавай стабільнасці МАК. Было падпісана доўгатэрміновае пагадненне з амерыканскай тэлевізійнай кампаніяй NBC, а таксама з некаторымі іншымі спонсарамі, у тым ліку з кітайскім рознічным гігантам Alibaba. Аднак трэба заўважыць, што зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне 2022 г. ужо зараз падаюцца новым выпрабаваннем. У сродках масавай інфармацыі пачаліся дыскусіі наконт байкоту спаборніцтваў па прычыне праблемы праў чалавека ў КНР – дыскрымінацыі мусульманскай меншасці ўйгураў і прыцяснення дэмакратычных актывістаў у Ганконгу [6]. Час ад часу прэзідэнта МАК папракалі за тое, што ён не прымаў адпаведных крокаў, каб пазбавіцца ад карупцыі, а таксама меў абвінавачванні за ўдзел у мерапрыемствах І Еўрапейскіх гульняў у Баку, повадам да чаго было зневажанне правоў чалавека ў Азербайджане [1]. Час прэзідэнтуры Т. Баха быў азмрочаны дзяржаўным спонсарствам допінгавай праграмы з боку Расіі на Гульнях у Сочы 2014 г., карупцыйнымі скандаламі ў Алімпіядзе-2016 у Рыа-дэ-Жанэйра. Да ўсяго гэтага дадалася неспрыяльная пандэмічная сітуацыя ва ўсім свеце з прычыны распаўсюджвання COVID-19, што прывяло да адмены Алімпійскіх гульняў у Токіа.

Спорт у сучасным грамадстве з улікам сваёй спецыфікі даўно набыў характар такога грамадскага феномена, які мае рысы татальнага пранікнення ў розныя сацыяльныя структуры. Зразумела, што гэта таксама датычыцца эканомікі, і калі вызначаць ролю спорту ў справе выхаду з сусветнага крызісу, то на гэтую акалічнасць нельга не звярнуць увагі, і ўрад кожнай краіны павінен скарыстацца яго патэнцыялам. Міжнародны алімпійскі камітэт, які з часоў кіраўніцтва Хуана Антоніа Самаранча набыў фінансавую стабільнасць, значную частку сваіх прыбыткаў выкарыстоўвае для падтрымкі і развіцця спорту на ўсім свеце. Асаблівая ўвага надаецца праграме пераўтварэнняў, таму што сацыяльнае асяроддзе мяняецца вельмі хутка, а падтрымка каштоўнасцяў алімпізму накіраваная на тое, каб грамадства стала лепшым. У сувязі з гэтым паўстае новая мэта – прагрэс, які разумеецца як умацаванне спорту ў грамадстве на аснове алімпійскіх каштоўнасцяў. Гэта новая філасофія развіцця: неабходна зразумець, якім чынам алімпіяды могуць быць адаптаваны да сацыяльна-эканамічных і спартыўных зацікаўленасцяў асобных гарадоў ці рэгіёнаў, здольных да пацвярджэння сваёй схільнасці да супрацьстаяння дыскрымінацыі ва ўсіх формах яе праявы і абвяшчэння першынства фундаментальных прынцыпаў алімпізму, дзе адным з прыярытэтных накірункаў з'яўляецца этычны складнік [19].

Перыяд кіравання Міжнародным алімпійскім камітэтам Томасам Бахам можна таксама ахарактарызаваць з пункту гледжання змены парадыгмы развіцця, калі значная ўвага стала надавацца сістэме алімпійскіх каштоўнасцяў, на што пастаянна робіцца акцэнт у шматлікіх дакументах, у тым ліку ў захаванні прыярытэтаў фундаментальных філасофскіх прынцыпаў алімпізму.

Новая рэдакцыя Алімпійскай хартыі, прыняцце Этычнага кодэкса, намаганні ў барацьбе з допінгам і карупцыяй, пільная ўвага да праблем з правамі чалавека і г. д. з'яўляюцца сведчаннямі таго, што сусветны спорт усё больш схіляецца да рэалізацыі адпаведнасцяў узорам высакароднага і справядлівага спаборніцтва.

Томас Бах выдатна разумее, што будучыня спорту залежыць ад моладзі, таму неабходна як мага больш цесна звязаць яго з адукацыяй. Спорт фарміруе такую сістэму каштоўнасцяў, якая дазваляе адаптавацца да сацыяльнага асяроддзя, вучыць паважаць правілы і працаваць у камандзе [2]. Патэн-

цыяльна цікавым накірункам тут можа стаць больш актыўнае развіццё кіберспорту па прычыне таго, што ён прадугледжвае сацыяльнае дыстанцыяванне. Хоць, з іншага боку, неабходна ўлічваць механізмы кіравання электроннымі і віртуальнымі формамі гэтых новых відаў [7].

Томас Бах пацвярджае свой намер балатавацца на наступны тэрмін, і вельмі верагодна, што ў 2021 г. ён атрымае вотум даверу пасля таго як амаль палова са 100 членаў Міжнароднага алімпійскага камітэта выказала станоўчае стаўленне да яго падчас online-версіі штогадовага пасяджэння ў 2020 г. [9].

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Bach accuses critics of Olympic Movement of ignorance and aggression [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.insidethegames.biz/articles/1057397/bach-accuses-critics-of-olympic-movement-of-ignorance-and-ag. – Date of access: 10.12.2020.
2. Change or be changed / IOC President Thomas Bach tells IMD alumni [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.imd.org/news/updates/Change-or-be-changed-IOC-President-Thomas-Bach-tells-IMD-alumni/. – Date of access: 11.12.2020.
3. Ethics / International Olympic Committee // IOC Ethics Commission. – Lausanne : Switzerland : International Olympic Committee, 2020. – 117 p.
4. Gene Testing Set Tokyo 2020. Says IOC Boss Thomas Bach In Anti-Doping Red-Flag Season [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.swimmingworldmagazine.com/news/anti-doping-red-flag-season-gene-testing-set-tokyo-2020-says-ioc-boss-thomas-bach/. – Date of access: 11.12.2020.
5. IOC president Bach reveals genetic drug-testing may be ready for Olympics [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.irishtimes.com/sport/ioc-president-bach-reveals-genetic-drug-testing-may-be-ready-for-olympics-1.4073368. – Date of access: 11.12.2020.
6. IOC’s Thomas Bach warns against Olympic boycotts, ready to run for 2nd term as president [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.cbc.ca/sports/olympics/ioc-thomas-bach-election-1.5653234. – Date of access: 11.12.2020.
7. IOC President Bach writes to Olympic Movement: Olympism and Corona [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.olympicchannel.com/en/stories/news/detail/ioc-president-bach-writes-olympic-movement-olympism-corona/. – Date of access: 11.12.2020.
8. IOC president Thomas Bach: No place to hide for drug cheats [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.olympic.org/news/ioc-president-thomas-bach-no-place-to-hide-for-drug-cheats. – Date of access: 11.12.2020.
9. IOC’s Thomas Bach warns against Olympic boycotts, ready to run for 2nd term as president [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.cbc.ca/sports/olympics/ioc-thomas-bach-election-1.5653234. – Date of access: 11.12.2020.
10. Olympic Charter (in force as from 26 June 2019) / International Olympic Committee. – Lausanne : Switzerland : International Olympic Committee, 2019. – 106 p.
11. Russia Banned From Competition for 4 Years Over Continuing Doping Scandal [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.voanews.com/europe/russia-banned-competition-4-years-over-continuing-doping-scandal. – Date of access: 11.12.2020.
12. Sánchez Pato, A. El olimpismo como filosofía de vida. Thomas Bach, paradigma de la carrera dual / A. Sánchez Pato // Cultura, Ciencia y Deporte. – 2015. – Vol. 10, nr 29. – P. 155–160.
13. Słoniewski, M. Wpływ przewodniczących Międzynarodowego Komitetu Olimpijskiego na przemiany w międzynarodowym ruchu olimpijskim po II wojnie światowej / M. Słoniewski. – Kultura fizyczna. – Prace naukowe Akademii im. Jana Długosza w Częstochowie. – 2017. – T. XVI. – Nr 1. – S. 47–74.
14. The independent commission report #1 [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.wada-ama.org/sites/default/files/resources/files/wada_independent_commission_report_-1_en.pdf. – Date of access: 12.11.2019.

15. The independent commission report #2 [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.wada-ama.org/sites/default/files/resources/files/wada_independent_commission_report_-2_2016_en_rev.pdf. – Date of access: 12.11.2019.

16. The International Olympic Committee. Promote olympism in society. Olympism in action. Speakers [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.olympic.org/olympism-in-action/speakers/thomas-bach. – Date of access: 10.12.2020.

17. The IOC has failed to protect its honest athletes in the doping scandal [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.theguardian.com/sport/blog/2016/jul/31/ioc-russia-doping-athletes-rio-olympics. – Date of access: 11.12.2020.

18. Thomas Bach President Opening speech to the 136th IOC Session p.2 [Electronic resource]. – Mode of access: https://stillmed.olympic.org/media/Document%20Library/OlympicOrg/IOC/Who-We-Are/IOC-Sessions/136-IOC-Session/136-IOC-Session-President-Bach-opening-speech.pdf#_ga=-2.201364114.289582370.1613637671-1146030017.1605854609. – Date of access: 18.02.2021.

19. Thomas Bach: We must be the change we want to see [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.insidethegames.biz/articles/1024622/thomas-bach-we-must-be-the-change-we-want-to-see. – Date of access: 11.12.2020.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 15.03.2021*